***Аляксандр Карцееў***

**НАРОДНА-АНСАМБЛЕВАЕ ВЫКАНАЛЬНІЦТВА
ЯК УМОВА ЯКАСНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ КАДРАЎ ВЫШЭЙШАЙ КВАЛІФІКАЦЫІ
(*напрамак спецыяльнасці 1-16 01 06 11 «Духавыя інструменты (народныя*)»**

У музычна-інструментальным выканальніцтве Беларусі ансамблевае, у тым лікуі народна-ансамблевае музіцыраванне. выступае і як форма выканальніцкага мастацтва [11, с. 45-46], і як састаўны кампанент нацыянальнай музычнай культуры [9, с. 200 – 205], і як магутны фактар стымулявання індывідуальных якасцей і ўзроўню выканальніцкага майстэрства айчынных музыкаў. Нам імпануе і меркаванне вядомага музыказнаўцы В.Антонович, якая разглядала народнае выканальніцкае мастацтва як адзін з крыніц узбагачэння прафесійнай творчасці на сучасным этапе развіцця нацыянальнай культуры [1].

Ансамблевае выканальніцтва на традыцыйных народных духавых інструментах беларусаў з'яўляецца адным з самабытна-спецыфічных напрамкаў народнай музычна-інструментальнага выканальніцтва Беларусі. Таму падрыхтоўка выканаўцаў на традыцыйных народных духавых музычных інструментах беларусаў і развіццё іх выканальніцкіх навыкаў сумеснага выканальніцтва з'яўляецца вельмі актуальнай у навучальным працэсе падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі Беларусі (напрамак спецыяльнасці 1-16 01 06 11 «Духавыя інструменты (народныя)».

Адзначым, што «Народна-ансамблевае выканаўства» з’яўляецца адной з асноўных дысцыплін у працэсе падрыхтоўкі выканаўцаў на народных духавых. Сумеснае музіцыраванне спрыяе фарміраванню прафесійных навыкаў, выхаванню маладых музыкантаў на лепшых узорах фальклорнай, народнай, класічнай і сучаснай музыкі. Удзел у ансамблі развівае музыкальныя здольнасці, рытм, слых, уплывае на выпрацоўку больш дасканалага пачуцця ансамблевай ігры. Падчас заняткаў студэнт набывае практыку калектыўнай ігры. Тут ёсць магчымасць выкарыстоўваць свой вопыт сольнага выканання, імправізацыі і практычна замацоўваць веды па музычна-тэарэтычных дысцыплінах. Ігра ў ансамблі актывізуе гарманічны слых, абвастрае пачуццё музычнага рытму. Ансамблевае выкананне патрабуе як індывідуальных, так і калектыўных намаганняў для дасягнення агульнага мастацкага выніку і выхоўвае ў студэнтаў пачуццё адказнасці па сумесным выкананні.

У працэсе навучання па дысцыпліне «Народна-ансамблевае выканаўства» студэнт павінен развіць наступныя навыкі: выканання рознымі штрыхамі традыцыйных і спецыфічных прыёмаў гуказдабывання; дакладнага інтанавання і ігры на слых; расшыфроўкі беларускай народнай музыкі. Праграма курса прадугледжвае развіццё ў студэнтаў уменняў: настройкі беларускіх народных духавых інструментаў з улікам спецыфікі іх гукаатрымання; лагічнай пабудовы фразіроўкі; дасягнення дынаміка-акустычнага балансу ў гучанні ансамбля; вырашэння пытанняў па выкананні метрарытмічных цяжкасцей; чытання нот незнаёмых твораў з ліста; выканання старадаўняй і сучаснай музыкі з улікам жанрава-стылявых асаблівасцей.

У працэсе навучання студэнты павінны атрымаць веды па наступных пытаннях: класіфікацыя, функцыянальныя і мастацка-выканальніцкія асаблівасці тыповых складаў ансамбля народных духавых інструментаў; сутнасць ансамблевага выканаўства; псіхолага-педагагічныя і арганізацыйна-метадычныя асаблівасці работы з удзельнікамі ансамбля на беларускіх народных духавых інструментах; этапы работы над музычнымі творамі, іх змест; выкананне варыянтаў музычных твораў і іх трактоўкі; функцыянальныя мастацка-выразныя магчымасці ансамбляў беларускіх народных духавых інструментаў; сацыякультурныя аспекты і асаблівасці арганізацыі канцэртна-выканальніцкай дзейнасці ансамбля беларускіх народных духавых.

Ансамблі народных духавых інструментаў вельмі разнастайныя як па саставу інструментаў, так і па колькасці выканаўцаў (удзельнікаў). Умоўна ўсе інструментальныя народныя духавыя ансамблі можна падзяліць на некалькі відаў: аднайменныя складзеныя з аднолькавых інструментаў (напрыклад, ансамбль дудак строй *in C*, ансамбль дуд строй *in D* і г.д.); родныя (напрыклад, ансамбль жалеек, ансамбль акарын); змешаныя (спалучэнне розных народных духавых інструментаў і груп).

Колькасць удзельнікаў ансамбля можа вар’іравацца ад двух да дзесяці і больш. Але ж, як паказвае практыка, найбольш эфектыўнымі з’яўляюцца наступныя формы ансамблевага музіцыравання: дуэт, трыо (тэрцэт), квартэт, квінтэт. Пры гэтым трэба ўлічваць, што пры большым складзе ансамбля кожны выканаўца нясе меншую нагрузку (па цяжкасці раздзялення фактуры твора на большую колькасць галасоў) і, наадварот, у малых саставах выканаўчыя задачы кожнага члена ансамбля ўзрастаюць. Студэнты у складзе вучэбнага інструментальнага ансамбля на працягу кожнага семестра павінны падрыхтаваць 3–4 творы да акадэмічнага выступлення і азнаёміцца не менш як з трыма творамі шляхам чытання нот з ліста. Асноўная частка заняткаў павінна праводзіцца ў форме рэпетыцый, на якіх студэнты атрымліваюць практычныя навыкі калектыўнай ігры.

Галоўнымі аб’ектамі на занятках дысцыпліны «Народна-ансамблевае выканаўства» з’яўляюцца: інтанацыйная чысціня, сінхроннасць і збалансаванасць гучання па вертыкалі і гарызанталі, дакладнасць метрарытму, а таксама ўраўнаважанасць дынамікі, выразнасць фразіроўкі, артыкуляцыі і штрыхоў, агульнасць выканальніцкага дыхання, выяўленне рэльефнай меладычнай лініі і фону.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На першых занятках выкладчык камплектуе саставы ансамбляў і падбірае рэпертуар з улікам індывідуальнай падрыхтоўкі выканаўцаў і іх прафесійных магчымасцей. Таму трэба вызначыць псіхолага-педагагічныя і арганізацыйныя пытанні, звязаныя з вучэбным працэсам. У музычным калектыве вельмі важныя псіхалагічная сумяшчальнасць выканаўцаў, а таксама зацікаўленасць іх у творчай плённай працы. Па гэтай прычыне падбор удзельнікаў ансамбля па магчымасці праводзіцца з улікам гэтых акалічнасцей.

Першапачатковым этапам у працэсе работы павінна быць папярэдняя эмацыянальная падрыхтоўка калектыву, выканаўцаў, прывядзенне ўдзельнікаў ансамбля да адзінага эталона вышыні гучання.

Трэба ўлічваць, што народныя духавыя маюць шэраг канструктыўных і тэхналагічных недахопаў, таму неабходна звярнуць асаблівую ўвагу на пытанні інтанавання, а ў канкрэтных выпадках, асабліва пры ігры на дудцы і акарыне, неабходна выкарыстоўваць дадатковую аплікатуру ў залежнасці ад меладычнай і гарманічнай лініі. Таксама трэба памятаць, што на жалейцы інтанацыя і чысціня гучання залежаць ад інтэнсіўнага пасылу і выдыху выканаўчага дыхання, а на дудзе – ад раўнамернага націску на мех. Таму галоўная задача выканаўцаў – навучыцца слухаць, аналізаваць інтэрвалы і акорды ў працэсе ігры і пры неабходнасці імгненна выпраўляць інтанацыйны строй. Гэта асабліва адносіцца да галасоў, якія выконваюць акампанемент і гарманічныя педалі.

Поспехі заняткаў народных духавых інструментаў і мастацкі ўзровень гучання ансамбля вызначаюцца якасцю індывідуальнай прапрацоўкі партый кожным з удзельнікаў, а таксама сістэматычнасцю і творчай накіраванасцю самастойных рэпетыцый. Вынікам усёй мэтанакіраванай работы ансамбля народных духавых павінен стаць дакладны прафесійны ўзровень выконваемых музычных твораў, розных па жанры і стылі.

У апошні час у ансамблевай літаратуры з’явілася значная колькасць музычных твораў для ансамбля народных духавых інструментаў, дзе кампазітары выкарыстоўваюць сучасныя прыёмы і штрыхі, характэрныя для джазавай і эстраднай музыкі. У сувязі з патрабаваннямі часу выкладчыкі павінны ўключыць у вучэбны рэпертуар музычныя творы, якія адпавядалі б дадзенай жанравай стылістыцы. Большая частка джазавых і эстрадных твораў выконваецца з выкарыстаннем дадаткова клавішных і ўдарных інструментаў. Адпаведны рэпертуар і спецыяльная літаратура дазволяць у дастатковай ступені развіваць у студэнтаў навыкі ансамблевага музіцыравання, а таксама спрыяюць пашырэнню кругагляду выканаўцы [2 – 7; 12 – 14 ].

**Спіс літаратуры:**


1. Антоневич, В.А. Народное исполнительское искусство как один из источников обогащения профессионального творчества на современном этапе / В.А. Антоневич // Вопросы культуры и искусства Белоруссии : респ. межвед. сб. – Мн. : Вышэйш. шк., 1982. – Вып. 1. – С. 68–71.
2. Беларуская народная інструментальная музыка / Фоназапісы, натацыя / рэд. і сістэматызацыя найгрышаў, уступ. арт. і навук. камент. І.Д.Назінай. – Мн. : Навука і тэхніка, 1989. – 655 с. – (Бел. нар. творчасць / АН БССР. Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору.)
3. Белорусские народные наигрыши / сост. и авт.вступ.ст. И.Д.Назина; под общ. ред. В.Петрова. – М. : Музыка, 1986. – 12с.
4. Благовещенский, И.П. К истории белорусской народной инструментальной музыки / И.П.Благовещенский // Благовещенский И.П. Некоторые вопросы музыкального искусства (педагогика, эстетика, фольклор). – Мн., 1965. – С. 103–143.
5. Гром, У. Галасы мінуўшчыны: зб. інструм. ансамбляў для бел. нар. духавых інструментаў / Гром У., Крамко А., Мангушаў І. ; Бел. ін-т культуры. – Мн., 2003. –130 с.
6. Европейская танцевальная музыка 17–18 веков : из арх. собр. Рос. нац. б-ки: Для аккордеона / ісполнит. ред. для аккорд. Г.Писняк. – Могилёв : Пересвет, 1995. – 40 с.
7. Інструментальная музыка Беларусі XVIII стагоддзя / рэсп. метад. кабінет па навуч. установах мастацтваў і культуры ; [склад. В.Ў.Дадзіёмава]. – Мн., 1991. – 111 с.
8. Коротеев, А.Л. Духовое искусство Беларуси: жанрово-стилистические поиски и перспективы развития / А.Л. Коротеев // Музыкальное искусство на рубеже столетий : материалы междунар. науч. конф. «Музыкальное творчество и XXI век: традиции, новации и перспективы», Минск, 21 апр. 2000 г. – Мн., 2000. – С.41–45.
9. Коротеев, А.Л. Исполнительство на традиционных народных духовых инструментах как структурный компонент национальной художественной культуры (в контексте искусствоведческого исследования духового искусства Беларуси) / А.Л. Коротеев // Культура. Наука. Творчество : VI Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 10-11 мая 2012 г. : сб. науч. ст. / Мин-во культуры Республики Беларусь; гос. ун-т культ. и искусств ; науч. ред. М.А.Можейко. – Минск : БГУКИ, 2012. – С. 200 – 205.
10. Коротеев, А.Л. Концепция обучения исполнителей на традиционных народных духовых и ударных музыкальных инструментах белорусов как условие развития художественной культуры Беларуси / А.Л. Коротеев // Аўтэнтычны фальклор: праблемы бытавання, вывучэння, перайманне : матэрыялы навук.-метад. канф., Мінск, 15 – 16 сак. 2007 г. / БДУКМ ; редкал.: М.Л. Кузьмініч (адк. рэд.). – Мн., 2007. – С. 138–144.
11. Карацееў, А.Л. Ансамблі духавых інструментаў у гісторыі музычнай культуры Беларусі / А.Л. Карацееў // Актуальныя праблемы і навуковыя пошукі ў галіне культуры і мастацтва : тэз. дакл. на навук.-творч. канф., Мінск, 19–20 крас. 1994 г. / Бел. ун-т культуры. – Мн., 1994. – С. 45–46.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

12. Новая радасць стала : хрэстаматыя па духоўнай харавой музыцы / Бел. ін-т праблем культуры; [уклад.: А.В. Пякуцька, З.Л. Леановіч, В.П. Маеўская; муз. рэд. Я.М. Рэўтовіч]. – Мн., 1995. – 60 с.
13. Помнікі музычнай культуры Беларусі: Інструментальная музыка XIX стагоддзя / Бел. ін-т праблем культуры ; [уклад. [А.І. Ахвердава]. – Мн., 1993. – 90 с.
14. Рэлігійная музыка Беларусі XVII–XVIII стагоддзяў : хрэстаматыя / уклад. Т.У. Ліхач ; Бел. дзярж. акад. музыкі. – Мн., 2000. – 58 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ